ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”

Аддзел бібліятэказнаўства



# Беларускія пісьменнікі-юбіляры 2016 года

## І паўгоддзе

**Мінск 2016**

ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”
Аддзел бібліятэказнаўства

# Беларускія пісьменнікі-юбіляры 2016 года:

## Бібліяграфічны паказальнік

## I паўгоддзе

**Мінск 2016**

## Змест

**Студзень.**
Іван Шамякін…………………………………………… 4

**Люты.**
Іван Мележ…………………………………………... 7

**Сакавік.**
Кандрат Крапіва ………………………………………. 10

**Красавік.**
Змітрок Бядуля …………………………………….. 13

**Май.**
Васіль Вітка …………………………………………… 16

**Чэрвень.** Генрых Далідовіч…………………............. 19



## Студзень

## Іван Шамякін

(1921–2004)

Нарадзіўся 30.01.1921 г. у вёсцы Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. У час Вялікай Айчыннай вайны выступаў у армейскай газеце «Часовой Севера» з нарысамі і вершамі. У 1945 г. надрукаваў аповесць «Помета» (часопіс «Полымя»). Аўтар раманаў «Глыбокая плынь» (1949, інсцэніраваны ў 1956), «У добры час» (1953), «Крыніцы» (1957, інсцэніраваны ў 1961), «Сэрца на далоні» (1964, інсцэніраваны ў 1965), «Снежныя зімы» (1970), «Атланты і карыятыды» (1974, аднайменны відэафільм Беларускага тэлебачання, 1980), «Вазьму твой боль» (1979, экранізаваны ў 1981), «Петраград - Брэст» (1983), «Зеніт» (1987). Цыкл з пяці аповесцей («Непаўторная вясна», 1957; «Начныя зарніцы», 1958; «Агонь і снег» і «Пошукі сустрэчы», 1959; «Мост», 1965) аб'яднаны ў пенталогію «Трывожнае шчасце» (1960, 1973, 1982). Выйшлі кнігі апавяданняў і аповесцей: «На знаёмых шляхах» (1949), «Дзве сілы» (1951), «Апавяданні» (1952), «Першае спатканне» (1956), «Матчыны рукі» (1961), «Вячэрні сеанс» (1968), «Лес майго земляка» (1970), «Бацька і дзеці» (1971), «Сцягі над штыкамі» (1976), «Гандлярка і паэт. Шлюбная ноч» (1976, пастаўлены кінафільмы адпаведна ў 1978 і 1980), «Браняпоезд «Таварыш Ленін» (1985), «У роднай сям'і» (1986), «Драма» (аповесці, гістарычныя сцэны, 1990), а таксама кніжка апавяданняў для дзяцей «У Маскву» (1950). У 1965−1966 гг. выйшаў збор твораў у 5-ці, ў 1977−1979 гг. – у 6-ці тамах.

Напісаў п'есы «Не верце цішыні» (апублікавана і пастаўлена ў 1958), «Выгнанне блудніцы» (апублікавана і пастаўлена ў 1961, асобнае выданне ў 1962), «Дзеці аднаго дома» (апублікавана і пастаўлена ў 1967), «Экзамен на восень» (1973, пастаўлена ў 1974), «Баталія на лузе» (1975), «І змоўклі птушкі» (1977, пастаўлена ў 1977), Залаты медаль»

(1979, пастаўлена ў 1980). Аўтар сцэнарыя 4-серыйнага тэлеспектакля «Трывожнае шчасце» (з А. Гутковічам, пастаўлены ў 1968), кінасцэнарыяў «Крыніцы» (з Ю. Шчарбаковым, пастаўлены ў 1964), «Хлеб пахне порахам» (пастаўлены ў 1974), «Атланты і карыятыды» (пастаўлены ў 1978). У 1974 г. выйшаў зборнік кінааповесцей і п'ес «Экзамен на восень».

Аўтар кніг публіцыстычных і літаратурна-крытычных артыкулаў «Размова з чытачом» (1973), «Карэнні і галіны» (1986).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951) за раман «Глыбокая плынь», Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1959) за раман «Крыніцы», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968) за раман «Сэрца на далоні» і кнігу «Трывожнае шчасце», Літаратурнай прэміі Міністэрства абароны СССР (1978) за кнігу «Гандлярка і паэт. Шлюбная ноч», Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне тэатральнага мастацтва, кінематаграфіі, радыё і тэлебачання (1982) за кінафільм «Вазьму твой боль».

## ***Творы:***

1. Атланты і карыятыды : раман / Іван Шамякін; [аўт. пасляcл. В. Каваленка; маст. В. А. Тарасаў]. – Мн. : Маст. літ., 1985.– 430 с. – (Беларускі раман).
2. Браняпоезд "Таварыш Ленін" : аповесці: [для ст. шк. узросту] / Іван Шамякін; [маст. А. М. Дэмарын]. – Мн. : Юнацтва, 1985.– 271 с., [1] л. партр. – (Б-ка юнацтва).
3. Вазьму твой боль : раман / Іван Шамякін. – Мн. : Маст. літ., 1979.– 384 с.
4. Дзве сілы : апавяданні / Іван Шамякін. – Мн. : ДВ БССР, 186 с.
5. Драма : аповесці, гіст. сцэны / Іван Шамякін; [пасляcл. А. А. Марціновіча]. – Мн. : Маст. літ., 1990.– 332, [2] с.
6. Зеніт : раман : [для ст. шк. узросту] / Іван Шамякін. – Мінск : Юнацтва, 1987.– 511 с.

7. Карэнні і галіны : партрэты настаўнікаў, сяброў, бацькоў, сваякоў, штрыхі аўтапартрэта / Іван Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 1986.– 397 с.
8. Крыніцы : раман / Іван Шамякін; [прадм.А.Марціновіча]. – Мн. : Маст.літ., 1996.– 351 с.
9. Палеская мадонна : аповесці: [для ст.шк.узросту] / Іван Шамякін; [маст. М. Рыжы]. – Мн. : Юнацтва, 1998.– 588, [2] с.
10. Петраград - Брэст : гіст. раман / Іван Шамякін ; [маст. Ю.Зайцаў]. – Мінск : Маст. літ., 1983.– 412 с.
11. Роздум на апошнім перагоне : дзённікі, 1980‒1995 гг. / Іван Шамякін. – Мн. : Маст.літ., 1998.– 527 с.
12. Сатанінскі тур : аповесці / Іван Шамякін. – Мн. : Маст. літ., 1995.– 317, [2] с.
13. Трывожнае шчасце : [пенталогія : для ст. шк. узросту] / Іван Шамякін. – Мн. : Юнацтва, 1983.– 576 с. – (Школьная б-ка).

## *Аб жыцці і творчасці*

1. Валынец, Л. Вывучэнне рамана "Сэрца на далоні" Івана Шамякіна // Роднае слова. ‒ 2005. ‒ № 11. ‒ С. 46‒51.
2. Гарадніцкі, Я. Аповесць Івана Шамякіна "Гандлярка і паэт": жанр, кампазіцыя, галасы аўтара і герояў / Яўген Гарадніцкі // Полымя. ‒ 2013. ‒ № 5. ‒ С. 130‒134.
3. Зубко, А. С. Іван Шамякін ‒ чалавек-эпоха : вечарына для вучняў 10‒11класаў / А. С. Зубко // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". ‒ 2016. ‒ № 1. ‒ С. 59‒64.
4. Іван Шамякін ‒ беларускім пісьменнікам // Полымя. ‒ 2011. ‒ № 1. ‒ С. 170‒179.
5. Іван Шамякін і рускія перакладчыкі ; падрыхтавала Алеся Шамякіна // Полымя. ‒ 2013. ‒ № 7. ‒ С. 110‒127.
6. Марціновіч, Дз. Іван Шамякін: новае прачытанне / Дзяніс Марціновіч // Дзеяслоў. ‒ 2012. ‒ № 5. ‒ С. 331‒334.
7. Шамякіна, Т. І. Петраград і Брэст : урок гісторыі / Таццяна Шамякіна // Полымя. ‒ 2014. ‒ № 3. ‒ С. 156‒170.
8. Шуцьева, Ж. Іван Шамякін ‒ чалавек вялікай душы і таленту // Роднае слова. ‒ 2009. ‒ № 10. ‒ С. 73‒74.

**Люты**



**Іван Мележ**
(1921–1976)

Нарадзіўся Іван Мележ у вёсцы Глінішчы Хойніцкага раёна 8 лютага 1921 года. У Івана было звычайнае вясковае дзяцінства і юнацтва. Спярша хлопец вучыўся ў пачатковай школе ў родных Глінішчах. У сямігодку давялося хадзіць у суседнюю вёску Алексічы. Пасля вучыўся ў Хойніках. Школу скончыў з атэстатам выдатніка. Спрабаваў паступаць у Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры, але не прайшоў па конкурсе. Вярнуўся ў Хойнікі, працаваў у райкаме камсамола.У 1939 годзе І. Мележ становіцца студэнтам таго ж маскоўскага інстытута, але з першага курса прызваны ў армію. Служыць на Украіне. Вялікая Айчынная вайна застала яго ў Карпатах, дзе ён трапляе ў самае пекла гарачых баёў. У 1942 годзе быў цяжка паранены пад Растовам. З пасведчаннем аб інваліднасці І. Мележ апынуўся ў горадзе Бугуруслане Чкалаўскай вобласці. У Малдаўскім педагагічным інстытуце выкладаў ваенную падрыхтоўку і сам вучыўся завочна на літаратурным факультэце. Тут пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай. Восенню Мележы едуць на Сходню пад Масквой, дзе аднавіў працу Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Тут ён вучыўся з 1943 па 1945 год.

За вялікія дасягненні ў развіцці беларускай савецкай літаратуры ў 1972 годзе яму прысвоена ганаровае званне народнага пісьменніка БССР. Раман "Людзі на балоце" ў 1962 годзе адзначаны Літаратурнай прэміяй імя Якуба Коласа, за раманы "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы" пісьменніку прысуджана Ленінская прэмія. У 1976 годзе Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа адзначана яго кніга "Жыццёвыя клопаты".

Пісаць вершы і апавяданні Іван Мележ пачаў яшчэ вучнем. У 1939 годзе быў апублікаваны яго першы верш "Радзіме". У часы вайны ўбачылі свет першыя апавяданні, сярод якіх "Апошняя аперацыя", "Сустрэча". У 1946 годзе выйшаў зборнік "У завіруху", дзе малады пісьменнік зрабіў рашучы крок да авалодвання майстэрствам псіхалагічнага аналізу. У 1948 годзе была выдадзена кніга прозы "Гарачы жнівень". З канца 1947 года па 1953 год ён працуе над раманам "Мінскі напрамак". У 50-я гады Мележ друкуе тры зборнікі прозы – "Блізкае і далёкае" (1954), "У гарах дажджы" (1957), "Што ён за чалавек" (1961). Аўтар выявіў у іх мастакоўскую ўвагу да маральна-этычнай праблематыкі. У гэты час з'явілася і некалькі п'ес Мележа.

У сталым узросце працуе над трылогіяй пад назвай "Палеская хроніка". У 1976 годзе выдаецца кніга "Жыццёвыя клопаты", якая была адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа.

Раннія творы Мележа вызначаліся вернасцю пісьменніка жыццёвай праўдзе, глыбокім псіхалагічным аналізам чалавечых учынкаў, вастрынёй сацыяльнага і духоўнага бачання рэчаіснасці. З самага пачатку Мележу былі характэрныя эпічная паўната і цэласнасць узнаўлення характараў і абставін. Гэта сведчыла пра тое, што ў лісаратуру прыйшоў арыгінальны мастак, які глыбока разумее і любіць чалавека, здольны ярка паказаць яго ўнутраны свет.

### *Творы*

1. Дні нараджэння; Хто прыйшоў уночы : п'есы / Іван Мележ. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1959. – 104 с.
2. Завеі,снежань : раман: з "Палес. хронікі" : для ст.шк.узросту / Іван Мележ ; афармл. В. Ф. Александровіч, А. І. Цароў. – Мінск : Маст.літ., 1995. – 240 с.
3. Людзі на балоце : раман : з "палескай хронікі" / Іван Мележ. – Мінск : Маст. літ, 1973. – 397, [2] с., [4] л. іл.

4. Пакуль вы маладыя : п'еса / Іван Мележ. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1958. – 76 с.
5. Подых навальніцы : роман з "Палескай хронікі" / Іван Мележ. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 477,[2] с. – (Беларуская проза XX стагоддзя).
6. У гарах дажджы : апавяданні / Іван Мележ. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1957. – 222 с.
7. У завіруху : апавяданні / Іван Мележ. – Мінск : ДВ БССР, 1946. – 64 с.

## ***Аб жыцці і творчасці***

1. Андраюк, С. Талент глыбока беларускі // Полымя.– 2001.– № 2. – С. 253.
2. Дайліда, В. Сэрдца Івана Мележа // Полымя. – 2005. – № 10.– С. 203–211.
3. Далідовіч, Г. З Глінішча – у свет вялікі // Полымя.– 2006. – № 2.– С. 160–165.
4. Дасаева, Т. М. "Жыць для літаратуры" // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2006. – № 1.– С. 3–8.
5. Казлова, В. Універсітэцкі шлях Івана Паўлавіча Мележа // Полымя. – 2006. – № 2. – С. 166–173.
6. Мяснікоў, А. "Я наглядаю з увагаю за фактамі жыцця..." // Полымя. – 2011. – № 2. – С. 118–125.



## Сакавік

### Кандрат Крапіва
(1896–1991)

Кандрат Крапіва (сапр.: Кандрат Кандратавіч Атраховіч) – беларускі пісьменнік, паэт, сатырык, драматург, перакладчык, грамадскі дзеяч, літаратуразнавец. 5 сакавіка 1896 г. у вёсцы Нізок Уздзенскага раёна. Уздзеншчына – шчодры край на паэтаў і пісьменнікаў. Вучыўся К. Крапіва ў Уздзенскім народным вучылішчы, Стаўбцоўскім і Койданаўскім чатырохкласных гарадскіх вучылішчах. Восенню 1913 г. эстэрнам здаў у Мінску экзамены на званне народнага настаўніка, працаваў у земскім народным учылішчы. У жніўні 1915 г. прызваны ў царскую армію, у складзе якой апынуўся на Заходнім і Румынскім франтах. Дэмабілізаваўшыся ў 1918 г,, вярнуўся на радзіму. Працаваў настаўнікам, а пазней быў прызваны ў Чырвоную Армію. Пасля дэмабілізацыі працаваў настаўнікам, інструктарам Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры, у рэдакцыі часопіса «Полымя рэвалюцыі». Скончыў літаратурна-лінгвістычнае ад дзяленне педагагічнага факультэта БДУ. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны працаваў у рздакцыі газет «Красноармейская правда» і «За Савецкую Беларусь». У 1943–1945 гг. быў адказным рэдактарам сатырычнай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». У пасляваенныя гады К. Крапіва працаваў рэдактарам сатырычнага часопіса «Вожык», загадчыкам сектара мовазнаўства Інстытута мовы і літаратуры Акадэміі наук, з 1952 г. – дырэктарам Інстытута мовазнаўства, а з 1956 г. – віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук. У апошнія гады жыцця – вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства. Аўтар п'ес «Канец дружбы»

(апублікавана і пастаўлена ў 1934), «Партызаны» (апублікавана і пастаўлена ў 1937), «Хто смяецца апошнім» (апублікавана і пастаўлена ў 1939, па сцэнарыі аўтара пастаўлены ў 1954 г. аднайменны кінафільм), «Проба агнём» (апублікавана і пастаўлена ў 1943), «Валодзеў гальштук» (1945, пастаўлена ў 1946, аднаактоўка), «Мілы чалавек» (1945, 1956, пастаўлена ў 1946), «З народам» (апублікавана і пастаўлена ў 1948), «Пяюць жаваранкі» (апублікавана і пастаўлена ў 1950, па сцэнарыі аўтара пастаўлены ў 1953 г. аднайменны кінафільм), «Зацікаўленая асоба» (апублікавана і пастаўлена ў 1953), «Людзі і д'яблы» (апублікавана і пастаўлена ў 1958), «Брама неўміручасці» (1973, пастаўлена ў 1974), «На вастрыі» (1982, пастаўлена ў 1983).

Памёр 7 студзеня 1991 г.

Пра Кандрата Крапіву створаны дакументальны фільм «Кандрат Крапіва» (1983, рэж. М. Купеева).

У Мінску на доме № 76 па праспекце Незалежнасці, у якім жыў пісьменнік, установлена мемарыяльная дошка.

Імя Кандрата Крапівы носяць вуліцы ў Мінску і Уздзе.

## *Творы*


1. Дыпламаваны баран. Махальнік Іваноў / Кандрат Крапіва // Зборнік твораў 1920 – сярэдзіны 1960-х гг. : проза паэзія. – Мінск, 2012. – С. 58–61.

2. Загадкі дзеда Кандрата : для мал. шк. узросту / Кандрат Крапіва. – Мінск : Юнацтва, 2002. – 23, [1] с.

3. Пучок жыгучкі : байкі: для ст. шк. узросту / Кандрат Крапіва; маст. У.Пашчасцеў. – Мінск : Маст. літ., 1973. – 79 с.

4. Смех і гнеў : выбранае / Кандрат Крапіва. – Мн. : Дзяржвыд БССР, 1946. – 90 с.

5. Хто смяецца апошнім : камедыі : [для ст. шк. узросту] / Кандрат Крапіва. – Мінск : Маст. літ., 2010. – 184, [2] с. – (Школьная б-ка).

## *Аб жыцці і творчасці*

1. Грыдзюшка, Т.К. Кандрат Крапіва – байкапісец // Беларуская мова і літаратура. – (Серыя "У дапамогу педагогу". – 2009.– № 10. – С. 20–23.
2. Елатомцава, І. М. Крапіва каля дома... : успаміны пра сям'ю Кандрата Крапівы / Ірына Ялатамцава // Роднае слова. – 2013. – № 8. – С. 86–91.
3. Клімчук, І. Нястомны працаўнік : літаратурна-музычная кампазіцыя па творчасці Кандрата Крапівы / І. Клімчук ; Л. Кокатава // Бібліятэка прапануе. – 2012. – № 3. – С. 12–16.
4. Сухава, Г. Станоўчыя вобразы ў п'есе "Хто смяецца апошнім" Кандрата Крапівы : урок беларускай літаратуры з элементамі актыўнай ацэнкі (10-ты клас) / Галіна Сухава // Роднае слова. – 2014. – № 10. – С. 59–61.



# Красавік

## Змітрок Бядуля
(1886–1941)

Змітрок Бядуля (сапр. Самуіл Плаўнік) нарадзіўся ў небагатай яўрэйскай сям'і ў вёсцы Пасадзец на Лагойшчыне. Бацька яго быў арандатарам, дробным гандляром, любіў музыку – граў на скрыпцы. Дзед, адзіны ў мястэчку каваль і меднік, меў уласную бібліятэку. Хлопчык вучыўся ў пачатковай яўбрэйскай школе – хедары, у школе рабінаў – ешыбоце. Ведаў іўрыт, ідыш, нямецкую, беларускую, рускую і польскую. Нейкі час працаваў хатнім настаўнікам іўрыту. Яшчэ хлопчыкам складаў вершы на іўрыце, але пачаткам яго літаратурнай дзейнасці лічыцца 1907 год, калі ён пачаў пісаць вершы на рускай мове і пасылаць іх у пецярбургскія часопісы. Там вершы хвалілі, але не друкавалі. Першы мастацкі твор будучага пісьменніка ўбачыў свет у газеце “Наша Ніва”.

Першы надрукаваны твор – імпрэсія на беларускай мове “Пяюць начлежнікі” (“Наша Ніва”, 1910). Друкаваў вершы па-руску ў часопісах “На берегах Невы” (Пецярбург) і “Молодые порывы” (Вільня). У 1913 годзн апублікаваў зборнік лірычных імпрэсій “Абразкі” (Пецярбург). У паслярэвалюцыйны час выйшлі кнігі паэзіі “Пад родным небам” (1922), “Буралом” (1925), “Паэмы” (1927), зборнікі апавяданняў “На зачарованых гонях” (1923), “Апавяданні” (1926), “Выбраныя апавяданні” (1926), “Танзілія” (1927), “Дэлегатка” (1928), “Тры пальцы” (1930), “Незвычайныя гісторыі” (1931), “Па пройдзеных сцежках” (1940), аповесці “Салавей” (1928, экранізаваная і пастаўленая ў 1937, аднайменны балет – у 1939), “Набліжэнне” (1935), “У дрымучых лясах  (1939, часопіс “Полымя”), двухтомны раман “Язэп Крушынскі” (1929–1932), “Выбраныя творы” (1934).

Выдаў дзіцячыя кнігі “Качачка-цацачка” (1927, казка), “Вясной” (1928, вершы), “Гаспадарка” (1930, вершы), “Мурашка-Палашка” (1939, вершаваная казка), “Люцік” (1940, верш), “Хлопчык з-пад Гродна” (1940, паэма). Выдаў даследаванне “Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных казках і песнях” (1924), кнігу нарысаў “Дзесяць” (1930).

Пераклаў з іўрыту на беларускую мову аповесць Шолама-Алейхема “Хлопчык Мотка” (1930), раман С. Годынера “Чалавек з вінтоўкай” (1933), кнігу С. Каган “Апавяданні” (1940), паасобныя вершы Т. Шаўчэнкі, Ю. Будзяка. Шмат твораў і зборнікаў выйшлі пасля смерці і ў пасляваенныя гады: “Апавяданні” (1947), “Мае забавы” (1949, вершы), “Сярэбраная табакерка” (1958, казка і апавяданні), “Дзень добры!” (1979, вершы, казкі, апавяданні), асобныя вершы, казкі. У 1951–1953 выйшаў Збор твораў у 4-х, у 1985–1989 – у 5тамах.

Памёр 3 лістапада 1941 каля Уральска, Расія.

## ***Творы***

1. Дзень добры! : вершы, казкі, апавяданні : [для дашк. узросту] / Змітрок Бядул. – Юнацтва, 1989. – 88 с. – (Залаты ключык).

2. Жыды на Беларусі : бытавыя штрыхі / Змітрок Бядуля. – Мінск : Адраджэньне, 1992. – 32 с.

3. Салавей : аповесць, апавяданні : [для сярэд. і ст. шк. узросту] / Змітрок Бядуля. – Мінск : Юнацтва, 2000. – 220, [2] с.

4. Спатканне : абразкі, мініяцюры, апавяданні / Змітрок Бядуля. – Мінск : Маст. літ., 2007.– 205, [1] с. – (Б-ка школьніка).

5. Сярэбраная табакерка : казка / Змітрок Бядуля. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 140 с.

## *Аб жыцці і творчасці*

1. Есіс, Я. В. Бацькі і дзеці ў апавяданні Змітрака Бядулі "На каляды к сыну" : (урок ў 7-м класе) / Я. В. Есіс // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2015. – № 12. – С. 15–17.

2. Навумчык, М. І. Вывучэнне апавядання Змітрака Бядулі "Бондар" : (тэставае заданне, 10-ты клас) / М. І. Навумчык // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2014. – № 10. – С. 26–27.

3. Несцяровіч, В.Б. "За дубовым сталом пішу залатым пяром" // Пачатковая школа.– 2006. – № 4. – С. 42–43.

4. Пабрацімы / Цімафей Лякумовіч // Полымя. – 2011. – № 12. – С. 116–123.

5. Птахі з падрэзанымі крыламі / Валянціна Локун // Полымя. – 2013. – № 11. – С. 146–154.

6. Саковіч, В. І. Апавяданне Змітрака Бядулі "На каляды к сыну". Душэўная трагедыя Тэклі : (урок ў 7-м класе) / В. І. Саковіч // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2015. – № 12. – С. 10–14.

## Май



### Васіль Вітка
(1911–1996)

Васіль Вітка (Цімох Васілевіч Крысько) нарадзіўся 16 мая 1911 у в. Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

В. Вітка – класік беларускай дзіцячай літаратуры, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1970). У 1972 г. за кнігі для дзяцей "Беларуская калыханка", "Казкі", "Чытанка-маляванка" пісьменнік быў адзначаны Дзяржаўнай прэміей БССР. У 1978 г. атрымаў Міжнародны ганаровы дыплом імя Х.-К. Андэрсена, і яго прозвішча было занесена ў спіс лепшых казачнікаў свету.

Пачынаючы з 1944 г. Цімох Васільевіч працаваў у часопісе "Беларусь", у 1948 г. стаў наменнікам рэдактара, а потым – галоўным рэдактарам газеты "Літаратура і мастацва".

Сапраўдную вядомасць ён набыў у дзіцячай літаратуры як паэт-казачнік. Амаль дваццаць гадоў Васіль Вітка аддаў выхаванню маленькіх грамадзян як рэдактар часопіса "Вясёлка". Першую вершаваную казку "Вавёрчына гора" паэт надрукаваў у 1948 г. Васіль Вітка вядомы і як перакладчык. Ён перакладае прозу і паэзію, "дарослую" і дзіцячую. Яму належаць пераклады з рускай мовы (М. Салтыкова-Шчадрына, А. Талстога, А. Чэхава, У. Маякоўскага, С. Маршака, С. Міхалкова, А. Барто, М. Рубцова), украінскай (М. Рыльскага, В. Бычко, М. Стэльмаха, П. Варанько), літоўскай (М. Вайнілайціса. В. Бараўскага), латышскай (Я. Райніса, В. Лукса, Я. Османіса), балгарскай (А. Босева, Л. Станчава), англійскай (У. Мэя).

Памёр Цімох Васільевіч 5 ліпеня 1996 г.

## *Творы*

1. Беларуская калыханка : паэма: для старэйш. шк. ўзросту / Васіль Вітка; маст. Г. Паплаўскі. – Мінск : Беларусь, 1971. – 40 с.
2. Вышыні святла : вершы / Васіль Вітка. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 110 с.
3. Дзеці і мы : дзённікі, нарысы, апавяданні / Васіль Вітка. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 270 с.
4. Для дома, для альбома і трохі для эпохі : гумар, сатыра / Васіль Вітка. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 175 с.
5. Дом, дзе жывуць словы : слоўнік народнай мовы для дзяцей / Васіль Вітка. – Мінск : Маст. літ., 1995.– 128 с.
6. Загадка пра зярнятка : верш / Васіль Вітка; маст. У. Савіч. – Мінск : Юнацтва, 1984.–16 с.
7. Мінскія балады : вершы : для сярэд. шк. узросту / Васіль Вітка; маст. Л. І. Зяневіч. – Мінск : Юнацтва, 1982. – 54 с.
8. Перад парогам : вершы, казкі / Васіль Вітка. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 241, [5] с.
9. Праводзіны лета : вершы / Васіль Вітка; іл. З.Бароўкі. – Мінск : Беларусь, 1972. – 158 с.
10. Роднае слова : кн. для чытання у 2-м кл. / Васіль Вітка. – Мінск : Нар. асвета, 1989. – 223 с.
11.Случчына : вершы, паэмы, казкі / Васіль Вітка; маст. У. С. Басалыга. – Мінск : Маст. літ., 1981.
12. Трэція пеўні : вершы, паэмы, пераклады / Васіль Вітка. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 159 с.
13. Урокі роднага слова : вершы, казкі, апавяданні / Васіль Вітка. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 263, [1] с.
14. Чытанка-маляванка : ладачкі-ладкі, лічылкі, загадкі, байкі, самагудкі, жарты, перакруткі, казкі, пацешкі, вясёлыя ўсмешкі : [для дзяцей дашк. і мл. шк. узросту] / Васіль Вітка. – Мінск : Юнацтва, 1998.– 175 с.
15. Шчасце паэта : драмат. паэма : у 4 акт.,10 карц. / Васіль Вітка. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1951. – 115 с.

## *Аб жыцці і творчасці*

1. Барысенка, В. Вобразнае азначэнне ў паэзіі Васіля Віткі // Роднае слова. – 2001. – № 5. – 28–31.
2. Бензярук, Р.М. Сем урокаў мудраца / Расціслаў Бензярук // Маладосць. – 2011. – № 6.– С.117–121.
3. "Будзеш ты ўсюды неразлучаны…" : [аб жыццёвым шляху В. Віткі]. – У кн.: Васелевіч А. Элегія : апавяданні, эцюды, эсэ. – Мінск: Маст літ., 1988. – С. 199–212.
4. Витка, В. Терпи, мужайся, верь / Василь Витка; публикация и предисловие Юлии Чернявской // Нёман. – 2010. – № 4. – С.148–172.
5. Вольскі, А. Казачнік, паэт, педагог: [75 год з дня нараджэння В. Віткі] // Нар. асвета. – 1986. – № 5. – С. 76–78.
6. Грахоўскі, С. З разведчыкаў шчасця: [пра Васіля Вітку ] // Грахоўскі С. Так і было. – Мінск, 1986. – С. 129–132.
7. Казека, Я. Гартаванне слова: [пра паэзію В. Віткі] / Я. Казека. – Мінск : Маст. літ., 1985. – С. 75–94.
8. Лобан, М. Валадар чароўнага ключыка: [да 60-годдзя з дня нараджэння В. Віткі] // ЛіМ. – 1971. –14 мая.
9. Лобан, М. Слова пра друга: [думкі пра паэзію В. Віткі]. – У кн.: Лобан М. Пяць раніц тыдня. – Мінск : Маст. літ., 1984. – 217–221.
10. Ляшук, В. Чарадзейства слоў // Полымя. – 1998. –№ 1. – С. 263–277.
11. Стральцоў, М. Настаўнік з вялікай літары. – У кн.: Стральцоў М. У полі зроку. Літаратурна-крытычныя артыкулы і эсэ. – Мн.: Маст. літ., 1926. – С. 110–112.
12. Яфімава, М. Б. Васіль Вітка (1911–1996) / М. Б. Яфімава // Літаратурныя партрэты. – Мінск, 2003. – С. 18–20.



**Чэрвень**
**Генрых Далідовіч**
(нар. 1946)

Нарадзіўся 01.06.1946 г. у вёсцы Янкавічы Стаўбцоўскага раёна Менскай вобласці ў сям'і каваля.

У 1968 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Шабыньскай няпоўнай сярэдняй школе Барысаўскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1969–1970). Зноў працаваў настаўнікам, а з 1971 г. – завучам у Шабыньскай школе. З 1973 г. – супрацоўнік аддзела прозы часопіса «Полымя», з 1979 г. – намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць». Сябра СП СССР з 1974 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1966 г. у стаўбцоўскай раённай газеце «Прамень». Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Дажджы над вёскай» (1974), «Цяпло на першацвет» (1976), «Маладыя гады» (1979), «Міланькі» (1980), «На новы парог» (1983), «Станаўленне» (1985), «Міг маладосці» (выбранае, 1987), раманаў «Гаспадар-камень» (1986), «Пабуджаныя» (1988), «Свой дом» (часопіс «Маладосць», 1989). Выступае ў друку з публіцыстычнымі і крытычнымі артыкуламі, эсэ.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1988) за раман «Гаспадар-камень».

### *Творы*

1. Гаспадар-камень : раман / Генрых Далідовіч. – Мінск : Маст. літ., 1987.– 446 с.
2. Дажджы над вёскай : апавяданні / Генрых Далідовіч. – Мінск : Маст. літ., 1974. – 157 с.

3. Жар кахання : апавяданні пра жанчын / Генрых Далідовіч; [маст. А. І. Карповіч]. – Мінск : Маст.літ., 1996. – 352 с.
4. Жывы покліч : выбранае / Генрых Далідовіч; прадм. А. Марціновіча. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 560 с.
5. Заходнікі : раман : для ст. шк. узросту / Генрых Далідовіч. – Мінск : Юнацтва, 1994. – 237 с.
6. Кліч роднага звона : раман-хроніка : [для ст. шк. узросту] / Генрых Далідовіч. – Мінск : Юнацтва, 2000. – 381, [2] с.
7. Міг маладосці : апавяданні, аповесці / Генрых Далідовіч. – Мн. : Маст. літ., 1987. – 439 с., 1 л. партр. – (Б-ка беларускай прозы).
8. Міланькі : аповесці / Генрых Далідовіч. – Мн. : Маст. літ., 1980. – 351 с.
9. Маладыя гады : апавяданні, аповесць / Генрых Далідовіч. – Мінск : Маст. літ., 1979. – 255 с.
10. На новы парог : аповесці / Генрых Далідовіч. – Мінск. : Маст. літ., 1983. – 272 с.
11. Пабуджаныя : раман / Генрых Далідовіч. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 567 с., [4] л. іл.
12. Свой дом : раман / Генрых Далідовіч. – Мінск. : Маст. літ., 1992. – 350 с.

## *Аб жыцці і творчасці*

1. Далідовіч, Г. З коласавага племені // ЛіМ. – 2004. – 12 сак. – С. 12.
2. Далідовіч, Г. Сіла ад роднай зямлі // Краязн. газ.– 2003. – №16 (снеж.). – С. 8.
3. Жолуд, С. Генрых Далідовіч [пісьменнік, ураджэнец Стаўбцоўшчыны] –лаўрэат Дзяржаўнай прэміі // Прамень.– 1997. – 4 студз.
4. Далідовіч, Г. Унутраны голас Анатоля Грачанікава / Генрых Далідовіч // Маладосць. – 2013. – № 9. – С. 111–114.

**Беларускія пісьменнікі-юбіляры 2016 года:**
**бібліяграфічны паказальнік (I паўгоддзе)**

Складальнікі: Мельнічак А.А.

Рэдактар: Законнікава Л.Р.

Адказны за выпуск: Лыка М.У.

Падпісана да друку 07.06.2016 г.

Тыраж 3 экз. Заказ № 9

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна”